УДК 581.5

С.А. Гейц, мл. навук. супр.
(Інстытут эксперыментальнай батанікі НАН Беларусі, г. Мінск)

# АСАБЛІВАСЦІ РАСПАЎСЮДЖВАННЯ САСНЯКОЎ ВЕРАСОВЫХ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ З 1970-х ПА 2016 гг.

Верасовыя лясы на тэрыторыі Беларусі ў асноўным прадстаўлены саснякамі і ў нязначнай ступені бярэзнікамі. Сасняк верасовы, які беларускімі лесатыполагамі вылучаецца ў асобны тып лесу, мае да канца нявызначаны фітацэнатычны статус. Вывучэнне экалогіі дадзенага тыпу лесу з'яўляецца актуальным, бо існуюць спрэчныя погляды пра прыроду яго паходжання.

Мэтай работы з'яўлялася вызначэнне дынамікі распаўсюджвання саснякоў верасовых з 1970-х па 2016 гг.

У 1970-х гг. верасовыя лясы займалі каля 16% усіх лясоў. Па звестках Дзяржаўнага ляснога кадастру Рэспублікі Беларусь на пачатак 2016 г. верасовыя лясы займаюць 2,4% усіх лясоў, дзе на долю саснякоў даводзіцца 95,4%. У 1970–1980-я гг. сасняк верасовы па займанай плошчы лічыўся шырока распаўсюджаным тыпам лесу. На пачатку 1970-х гг. на яго долю даводзілася 32% плошчы ўсёй сасновай фармацыі. У 1980-х гг. сасняк верасовы займаў каля 20% сасновых лясоў і знаходзіўся на другім месцы па распаўсюджанасці пасля сасняка імшыстага. На пачатку 2008 г. дадзены тып сасновага лесу з працэнтнай доляй 7,2% размяшчаўся на чацвёртым месцы пасля саснякоў імшыстага, чарнічнага і арляковага. На пачатак 2016 г. сасняк верасовы займае 4,5% плошчы сасновай фармацыі і размяшчаецца на шостым месцы пасля саснякоў імшыстага, арляковага, чарнічнага, нязначна пры гэтым саступаючы саснякам кіслічнаму і даўгамошнаму.

На Беларусі верасовыя лясы распаўсюджаны нераўнамерна. Нягледзячы на тое, што індыкатар свежых бароў *Calluna vulgaris* мае шырокую экалагічную амплітуду на поўначы краіны, у большай ступені сасняк верасовы прадстаўлены на поўдні і захадзе рэспублікі. Колькасць верасовых лясоў на Беларусі значна паменшылася з 1970-х па 2016 гг. Удзельная вага сасняка верасовага ў 1970–80-х гг. была значна перабольшана, бо да яго лесаўпарадкавальнікі адносілі карэнныя і вытворныя тыпы лесу з пераважаннем верасу. Маладыя сасновыя насаджэнні на свежых глебах і на тэрыторыях пасля пажару з шырокім распаўсюджваннем *C. vulgaris* маглі таксама адносіцца да сасняков верасовых. Кліматычныя змяненні (павышэнне арыднасці і працэсы эўтрафікацыі), прыродныя і антрапагенныя парушэнні ў значнай ступені маглі паўплываць на змяненне дынамікі распаўсюджвання верасовых лясоў.